УДК 323.3(476)

*Э. Р. Іофе, Г. І. Сцяпанаў*

# ХАРАКТЭРНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ ЯК СУБ'ЕКТА САЦЫЯЛЬНЫХ ДЗЕЯННЯЎ

Сацыяльнае дзеянне — гэта лакалізаваны ў прасторы і часе канкрэтны акт дзейнасці грамадскага суб'екта па пераўтварэнні сацыяльнай сітуацыі адпаведна яго патрэбнасцям і мэтам. Рэалізуецца пры дапамозе змянення паводзін установак імкнення другіх індывідаў альбо супольнасцяў.

Адным з асноўных суб'ектаў сацыяльных дзеянняў з'яўляецца моладзь. Па выніках рэспубліканскага перапісу насельніцтва 1999 г., моладзь ва ўзросце 15—29 гадоў складае 21,9 % ад усяго насельніцтва Рэспублікі Беларусь [1].

Разглядаючы пытанне аб характэрных асаблівасцях моладзі як суб'екта сацыяльных дзеянняў, мы павінны ўлічваць сукупнасць ідэй, настрояў, каштоўнасных арыентацый гэтай спецыфічнай, яшчэ не зусім сталай часткі насельніцтва. Сучаснасць прад'яўляе новыя патрабаванні да моладзі, падвяргае праверцы яе здольнасці забяспечыць няўхільны рост эканомікі, удасканаліць грамадскія адносіны, расшырыць і паглыбіць дэмакратыю.

Свядомасць і паводзіны кожнага юнака і кожнай дзяўчыны, іх маральныя адносіны сацыяльна абумоўлены. Індывідуальная псіхіка вызначаецца грамадскім асяроддзем, нясе яго адбітак. Менавіта сацыяльныя бакі фарміравання псіхікі і развіцця асобы вывучае сацыяльная псіхалогія. Безумоўна, асновай маральнага развіцця моладзі і становіцца сацыяльная каардынацыя паводзін маладога чалавека з паводзінамі сацыяльнай супольнасці, калектыву з іх грамадскай думкай.

Сучаснае грамадства зацікаўлена ў актыўнай моладзі, сацыяльна сталай, якая ўдзельнічае ў рашэнні ўсіх складаных пытанняў і праблем, што стаяць перад краінай.

Меркаваць аб сацыяльнай сталасці маладога чалавека па наяўнасці ў яго шырокіх ведаў нельга. Аб узроўні сацыяльнай падрыхтаванасці, сацыяльнай сталасці і актыўнасці асобы можна правільна разважаць па яго справах. Менавіта ў практычнай дзейнасці, актыўным удзеле ў працэсе абнаўлення грамадства — сэнс і галоўны крытэрый сацыяльнай сталасці людзей, у тым ліку моладзі.

Накіраванасць і змест інтэграцыі ў грамадскія структуры вызначаецца, з аднаго боку, становішчам моладзі ў грамадстве,

адносінамі грамадства да моладзі, а з другога — уласнымі ўяўленнямі моладзі аб сваім сацыяльным статусе.

Аналіз сацыяльнага становішча моладзі Беларусі за апошнюю пяцігодку паказвае, што найбольш ушчэмленая эканамічна і значна бяспраўная ў сацыяльна-прававых адносінах тая частка маладых людзей, якая жыве ва ўмовах павышанага сацыяльна-псіхалагічнага дыскамфорту. Адсутнасць ідэалаў у многіх маладых людзей, рост ліку самазабойстваў, распаўсюджанасць наркаманіі, прастытуцыі, дзедаўшчына ў арміі, іншыя негатыўныя з'явы вядуць да нарастання сацыяльнай напружанасці ў асяроддзі моладзі.

Складанае сацыяльнае становішча, адсутнасць у большасці юнакоў і дзяўчат эканамічнай самастойнасці, прафесійнага статусу, пэўных сацыяльна-палітычных і духоўных арыенціраў — усё гэта вызначае праблему інтэграцыі маладога пакалення ў грамадскія адносіны.

Шматлікія сацыялагічныя апытанні, праведзеныя ў Рэспубліцы Беларусь за апошнія гады, даюць магчымасць зрабіць выснову аб агульным каштоўнасным і нарматыўным крызісе ў моладзі.

У аснову артыкула пакладзены даныя анкетнага апытання, праведзенага намі сярод студэнтаў БДПУ і БДУ ў 2000—2001 гг. Выкарыстоўваліся таксама даныя анкетных апытанняў, праведзеных іншымі выкладчыкамі кафедры паліталогіі і права БДПУ. Асноўная частка апытаных (каля 90 %) — маладыя людзі 17—22 гадоў. Усяго апытана 1560 студэнтаў розных курсаў і факультэтаў.

У маладзёжнай свядомасці і жыццёвых арыентацыях істотна знізілася каштоўнасць працы і вучобы як фактараў самасцвярджэння асобы (у шкале студэнцкіх яны займаюць 4-е і 6-е месца, у той час як у канцы 80-х гг. яны знаходзіліся на двух першых). Затое рэзка ўзрасла значнасць такіх жыццёвых каштоўнасцяў, як жыццё, яго небяспека, дружба, каханне, сям'я, матэрыяльны дабрабыт, грошы, якія займаюць у каштоўнаснай іерархіі маладых людзей першыя тры месцы. Набылі значнасць такія жыццёвыя каштоўнасці, як павышэнне прафесійнага ўзроўню, надзея на выпадак, удачу, шанцаванне.

У моладзі, у тым ліку студэнцкай, рэзка знізіўся інтарэс да палітыкі. Ёй цікавяцца больш за 30 % маладых людзей, маюць некаторую цікавасць — 51,2 %, а моцную — менш чым 10 % рэспандэнтаў. Уяўляючы сваё будучае, у сваіх ацэнках і меркаваннях большасць моладзі праяўляе прагматычны падыход. Хаця некаторая частка студэнтаў баіцца беспрацоўя, усё ж большасць з іх спадзяецца на выбраную спецыяльнасць, прафесію. Пагаджаючыся з важнасцю, грамадскай карыснасцю і творчым

зместам будучай працоўнай дзейнасці, 34,4 % апытаных мяркуюць, што нельга забываць аб заработку. Кожны адзінаццаты жадае любую працу з добрай зарплатай; кожны чацвёрты праявіць да працы жыццёвы інтарэс, калі яна дасць магчымасць здзейсніць асабістыя інтарэсы і планы. Практычна кожны другі студэнт шукае сабе працу.

Зрабіць гэта нялёгка, паколькі жадаючых шмат. Маладыя людзі бяруцца за любую работу, працуюць прыбіральшчыкамі, наглядаюць за дзецьмі, старымі, інвалідамі.

Сярод тых, хто звярнуўся ў 2000 г. за садзеяннем у працаўладкаванні, 211,8 тыс. жыхароў Беларусі, 51,8 % склалі маладыя людзі ва ўзросце 16—29 гадоў. Беспрацоўных зарэгістравана 109,7 тыс. маладых людзей [2].

У пошуках работы 55 % разлічваюць на сябе. Для большай упэўненасці (многія студэнткі адзначылі — «для эканамічнай незалежнасці».— ***Э. І., Г. С.***) апытаныя жадаюць атрымаць вышэйшую адукацыю (58,3 %), авалодаць адной альбо некалькімі замежнымі мовамі (28,5 %), ведамі ў галіне права (16,2 %), умець граматна карыстацца камп'ютэрам (15,6 %), правільна мысліць і дзейнічаць ва ўмовах рынкавай эканомікі (13,7 %).

Актыўная роля моладзі ў працэсе сацыялізацыі абумоўлена тым, што яна не столькі пераймае прапанаваныя ўзоры паводзін, колькі ўносіць у іх новы змест пад уплывам змяніўшыхся ўмоў жыцця. Пераходныя працэсы, якія пачаліся ў нашай рэспубліцы ў канцы 80-х гг., патрабавалі новага ўзроўню сацыялізацыі моладзі, які быў звязаны з уключэннем яе ў неўласцівыя папярэднім пакаленням грамадска-эканамічныя адносіны, новыя каштоўнасці, выкліканыя новай сістэмай матывацыі.

Кожны шосты з апытаных студэнтаў плануе арганізаваць пасля атрымання спецыяльнасці сваю справу. У тройку самых прэстыжных прафесій рэспандэнты ўключаюць «вопытнага і ўсебакова эрудыраванага юрыста, прадпрымальніка і менеджэра, эканаміста шырокага профілю (адпаведна 22,5 %, 19 % і 13,2 %).

Каля 3 % апытаных уключылі сюды рэкет і махлярства.

Больш за 8 % рэспандэнтаў мяркуюць, што «не так страшна ўдзельнічаць у крымінальных групоўках». У 14 % такія ж адносіны да прастытуцыі. Прывядзём сумаваныя адказы студэнтаў факультэтаў прыродазнаўства, дашкольнага выхавання, сацыяльнай педагогікі і практычнай псіхалогіі БДПУ на пытанні анкеты «Якім ты бачыш наша будучае ў рынкавых адносінах?»:

1. Большасць людзей будзе жыць багацей — 55,5 %.
2. Большасць людзей будзе жыць бядней — 44,5 %.
3. Апраўданае расслаенне на багатых і бедных — 61,6 %.
4. Неапраўданае расслаенне на багатых і бедных — 38,4 %.
5. Беспрацоўе створыць стымул да добрай працы — 54 %.

6. Беспрацоўе дасць магчымасць ушчаміць правы рабочых — 36 %.
7. Людзі стануць больш свабоднымі — 56 %.
8. Людзі стануць больш залежнымі — 34 %.
9. Пашырацца магчымасці для моладзі — 72 %.
10. Павялічацца перашкоды для моладзі — 28 %.

У наш час уменне «скалаціць» уласнасць, маёмасць, багацце разглядаецца ў якасці асноўнага вымярэння чалавечай годнасці. Даўно не пытаюцца аб тым, дзе людзі знаходзяць грошы. Дыферэнцыяцыя моладзі, якая расце з кожным годам, штурхае падрастаючае пакаленне ў розныя грамадскія сферы, якія могуць прынесці які-небудзь даход. Думкі аб тым, што каштоўнасць чалавека вызначаецца карыснасцю яго працы для грамадства, прытрымоўваліся 35 % студэнтаў, а 44 % бачылі сэнс жыцця ў самарэалізацыі і дасягненні поспеху [3], прычым рознымі шляхамі.

Аналіз канкрэтных паводзін часткі студэнцкай моладзі мінскіх ВНУ, праведзены на аснове існуючых сацыялагічных даных, паказвае, што сярод моладзі высокі прэстыж атрымалі камерцыйная дзейнасць і прадпрымальніцтва. Каштоўнасці, што сцвярджаюцца сярод прадпрымальнікаў Беларусі, служаць арыенцірам паводзін для маладых. Нашы даследаванні паказваюць, што ў свядомасці моладзі ідзе працэс пераацэнкі жыццёвых каштоўнасцяў: пераважаюць выказванні аб тым, што буйная маёмасць часцей ствараецца вялікай працай, людзьмі разумнымі і прадпрымальнымі.

Л. І. Шумская правяла арыгінальнае комплекснае тэарэтыка-прыкладное даследаванне асаблівасцяў сацыялізацыі студэнцкай моладзі Рэспублікі Беларусь.

Аналізуючы характарыстыку беларускімі студэнтамі найбольш важных якасцяў студэнта, даследчыца прыходзіць да высновы, што вядучае месца ў гэтай характарыстыцы займаюць такія валявыя якасці асобы, як сіла волі і мэтанакіраванасць (74,3 %), працалюбства (50,7 %). Відавочна, на думку Л. І. Шумскай, што час і складаныя супярэчнасці, у якіх фарміруюцца сацыяльна-эканамічныя асновы нашай дзяржавы, адбіліся на пераменах у свядомасці моладзі. Найбольш актыўная частка моладзі, да якой адносіцца студэнцтва, пачынае ўсведамляць, што жыццёвая перспектыва і сацыяльныя магчымасці асобы залежаць ад яе самой, яе асобаснага патэнцыялу. Адсюль і разуменне неабходнасці развіцця ў сабе працалюбства, мэтанакіраванасці і іншых валявых якасцяў [4].

У той жа час на ўзровень эмацыянальнага стану студэнцкай моладзі істотна ўплываюць супярэчнасці, звязаныя са станаўленнем дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь.

Нашы даследаванні сярод студэнтаў БДПУ і Міжнароднага гуманітарнага інстытута БДУ даюць падставы заключыць, што

каля 70 % рэспандэнтаў няўпэўнены ў бліжэйшым будучым. Гэту няўпэўненасць можна разглядаць як страту традыцыйнай у мінулым аховы асобы з боку грамадства і яе бліжэйшага сацыяльнага асяроддзя.

Рэфармаваная сфера працы не прынесла моладзі нашай рэспублікі чакаемай свабоды ў прафесійным самавызначэнні. Значная яе частка папала ў новую залежнасць ад работадаўцаў і акцыянераў, дзейнасць якіх не абмежавана развітымі механізмамі сацыяльнай аховы. У гэтых умовах больш паловы рэспандэнтаў не здольны абараніць свае правы. Згодна з данымі нашага даследавання, толькі 16 % студэнтаў вераць у прытрымліванне правоў чалавека ў Рэспубліцы Беларусь і толькі 12 % — у наяўнасць сістэмы сацыяльнай аховы.

Напружанасць становішча ў многіх галінах эканомікі Беларусі, неадэкватная аплата працы ў розных сектарах эканомікі, на дзяржаўных прадпрыемствах і ў прыватных фірмах у канцы XX — пачатку XXI ст. абмежавалі сферы прыкладання сіл моладзі. Паколькі большасць маладых людзей вымушана трымацца за любую працу, амаль 50 % нашых рэспандэнтаў не выключае магчымасці раней ці пазней змяніць форму дзейнасці. Гэта паставіць перад нашым грамадствам шэраг праблем, патрабуючых рашэння ў рамках дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі: ад задавальнення запытаў моладзі на перакваліфікацыю і другую адукацыю да фарміравання некаторага маргінальнага слою, які перабіваецца выпадковымі заробкамі.

Вынікі сацыялагічных даследаванняў сярод студэнтаў ВНУ нашай рэспублікі дазволілі зафіксаваць змену сацыяльных арыенціраў сучасных беларускіх студэнтаў з грамадскіх (грамадска-палітычная актыўнасць, калектывісцкае ўзаемадзеянне), характэрных для папярэдніх пакаленняў студэнтаў, на суб'ектыўна-асобасныя (самарэалізацыя, здароўе, матэрыяльны дабрабыт, сям'я, сябры).

Падкрэслім, што ў якасці важнейшых асобасных прыярытэтаў выступаюць такія пазітыўныя сацыякультурныя арыентацыі студэнцтва, як патрэбнасць у самарэалізацыі і актыўным самасцвярджэнні ў грамадстве, у якаснай адукацыі і сацыяльнай значнасці будучай прафесійнай дзейнасці [5, с. 191—192].

Мэтай сучаснай маладзёжнай палітыкі неабходна лічыць выяўленне і рэалізацыю інтарэсаў і патрэбнасцяў моладзі, рэгуляванне адносін паміж моладдзю і грамадствам, моладдзю і іншымі сацыяльнымі групамі, нарэшце, паміж асобнымі падгрупамі моладзі ў рамках сацыяльнай групы «моладзь».

Своеасаблівасць маладзёжнай палітыкі ў тым, што ў працэсе яе ажыццяўлення моладзь прызвана выступаць у якасці не толькі аб'екта, але і, што важна, суб'екта палітыкі. Без пастаяннай

дзейнасці маладых людзей ва ўсіх сферах грамадскага жыцця рэалізацыя маладзёжнай палітыкі і атрыманне ёй сацыяльна значных вынікаў немагчымы. Важна ўлічваць, што моладзь значна вастрэй, чым іншыя сацыяльныя групы, успрымае метады ціску, насілля, адміністравання пры рашэнні пытанняў, звязаных з непасрэдным удзелам моладзі [5, с. 215].

Падкрэслім, што тыя ці іншыя характэрныя асаблівасці моладзі звязаны не столькі з удасканаленнем дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі, колькі з рашэннем ключавых пытанняў эканамічнага, палітычнага і сацыяльнага развіцця беларускага грамадства.

У заключэнне яшчэ раз адзначым: студэнцкая моладзь розная, як была рознай заўсёды. За гэтай «рознасцю» трэба бачыць супярэчлівасць паміж імкненнямі моладзі і суровай рэчаіснасцю, якая застаўляе яе дзейнічаць насуперак сваім жыццёвым прынцыпам, яе неадназначнасць, рознанакіраванасць працэсу рэалізацыі яе жыццёвых установак. Застаецца спадзявацца, што наступіць час, калі моладзь Беларусі стане актыўным суб'ектам сацыяльных дзеянняў ва ўсіх сферах жыцця грамадства. Ад таго, наколькі хутка ён прыйдзе, залежыць будучае нашай краіны.

*ЛІТАРАТУРА*

1. *Зиновский В. И.* Численность и основные социально-демографические характеристики населения Республики Беларусь по данным переписи населения 1999 года // Социология. 1999. № 4. С. 7.
2. *Кохонов Н. Д., Яковчук В. Н.* Направления социальной поддержки молодежи на рынке труда Беларуси // Беларусь: вчера, сегодня, завтра. По материалам социологического мониторинга: Сб. науч. тр. Мн., 2001. С. 122.
3. Социология молодежи / Ю. Г. Волков, В. И. Добреньков, Ф. Д. Кадария, И. П. Савченко, В. А. Шаповалов. Ростов н/Д., 2001. С. 377.
4. *Шумская Л. И.* Социализация студенческой молодежи. Мн., 2001.
5. *Ищенко Т. В., Пахоменко В. С.* Современная молодежная политика как условие социализации молодого поколения // Ценностные ориентации белорусской молодежи на рубеже XXI века: Материалы региональной научно-практической конференции, 3—4 февраля 1998 г. Могилев, 1998. С. 15.

*SUMMARY*

*The most characteristic peculiarities of the youth of Belarus as a subject of social activities under conditions of social political transformation of the society.*